**18.** Дадзены рады літар:
*1) л, з, в, а, к, а; 2) у, п, а, р, с; 3) л, т, у, о, ф, б; 4) с, о, к, а, м, п.*
У якім радзе з літар можна скласці слова, якое будзе называць від спорту?
**А)** няма такога слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**19.** Колькі санорных гукаў у сучаснай беларускай мове?
**А)** няма такіх гукаў. **Б)** 4. **В)** 9. **Г)** 11. **Д)** 12.

**20.** Як можна назваць папярэдніка па бацькоўскай або мацярынскай лініі ў адносінах да свайго пераемніка? Выберыце правільныя варыянты з прыведзеных:
*1) продак; 2) дачка; 3) сястра;*
*4) брат; 5) дзядуля; 6) бабуля; 7) сын.*
**А)** 1. **Б)** 1, 5, 6. **В)** 1, 2, 7. **Г)** 3, 4. **Д)** 5, 6.

**21.** У якім выразе няма арфаграфічных памылак?
**А)** Солнца заходзіла. **Б)** Сонца заходіла. **В)** Сонца захадзіла.
**Г)** Сонца заходзіла. **Д)** Сонцэ заходзіла.

**22.** Якія словы з прыведзеных наогул не маюцьканчатка:
*1) педаль; 2) піяніна; 3) воўк; 4) прас; 5) шумна; 6) каравай?*
**А)** няма такіх слоў. **Б)** усе словы. **В)** 1, 4, 5, 6.
**Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4, 6.

**23.** У польскай мове ёсць слова *kolczyki* (кольчыкі). У перакладзе на беларускую мову гэта – ...
**А)** завушніцы. **Б)** напарстак. **В)** кола. **Г)** пярсцёнак. **Д)** абруч.

**24.** Як называецца навука, якая вывучае прыказкі і прымаўкі?
**А)** графіка. **Б)** парцэляцыя. **В)** лексікаграфія.
**Г)** парэміялогія. **Д)** лінгвакультуралогія.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01; e-mail: info@bakonkurs.org*
*http://www.bakonkurs.org/*

ГА «Беларуская асацыяцыя «Конкурс». Заказ 9. Тыраж 19400 экз. г. Мінск. 2007 г.

Конкурс па беларускай мове

# “БУСЛІК-2007”

*Чацвер, 15 лютага 2007 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Якую назву мае літара ***ч***?
**А)** чу. **Б)** чо. **В)** чы. **Г)** чэ. **Д)** ча.

**2.** Як вы лічыце, якое слова неабходна ўставіць замест кропак у вершаваных радках М. Пазнякова?

*Цагліну да цагліны –*
*І будзе новы дом.*
*А літару да літары –*
*І ... мы складзём.*

**А)** вокны. **Б)** шафу. **В)** школу. **Г)** падручнік. **Д)** слова.

**3.** Аленка доўга разбірала словы, у якіх, адкінуўшы першы склад, можна было б прачытаць назву дрэва. Які правільны варыянт выбрала Аленка?
*1) Барыс; 2) Цімох; 3) Рыгорка; 4) Пілінка; 5) Якуб; 6) Параска.*
**А)** 2, 4. **Б)** 1. **В)** 3, 5. **Г)** 4. **Д)** 6.

**4.** Вызначце, колькі слоў у сказе: *Адталаадзімовагаснегузямля*?
**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**5.** Закончыце народную прыказку: *Хто працуе, таму і...*

**А)** зарплату даюць. **Б)** пашана. **В)** добра.
**Г)** шанцуе. **Д)** абыходзіцца.

**6.** Вызначце колькасць словазлучэнняў у вершаваных радках С. Грахоўскага.

*Зямля пасля дзённае спёкі*
*Сыходзіць да ранку цяплом.*
*За сіняй маланкай далёкі*
*адразу пачуецца гром.*

**А)** 2. **Б)** 6. **В)** 8. **Г)** 10. **Д)** 12.

**7.** Дадзены словы: *1) адзенне; 2) вясна; 3) задача; 4) паветра; 5) сустрэча; 6) неба; 7) раніца; 8) возера; 9) хваля.* Вызначце толькі назоўнікі ніякага роду?

**А)** 1, 3, 5, 7. **Б)** 1, 4, 6, 8. **В)** 2, 4, 6, 7. **Г)** 2, 5, 8, 9. **Д)** 3, 4, 6, 9.

**8.** Колькі разоў паўтараецца гук [***р***] у дзеясловах, ужытых у вершаваных радках М. Янчанкі?

*Сам зрабіў я, сам прыбіў*
*ля акенца скрыначку.*
*Круп насыпаў, пакрышыў*
*хлебную скарыначку.*

**А)** 0. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**9.** Вызначце радок з лішнім словам:

*1) спорт, спартсмен, спартанец, спартыўны, спартакіяда, спартыўкі;*
*2) ноч, начны, начаваць, начнік, начасаць, начніца;*
*3) агарод, агародны, агародчык, агародніна, агароднік, агароднінны;*
*4) гара, горка, гарысты, горны.*

**А)** няма радка з лішнім словам. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**10.** У якім парадку трэба паставіць сказы, каб атрымаўся тэкст?

*1) Паліў дождж.* *2) Узняўся вецер.* *3) Бліснула маланка.*
*4) Насунулася хмара.* *5) Загрымеў гром.*

**А)** 1, 2, 3, 4, 5. **Б)** 2, 4, 3, 5, 1. **В)** 3, 2, 5, 4, 1.
**Г)** 4, 3, 5, 1, 2. **Д)** 5, 3, 4, 1, 2.

**11.** Якія словы з'яўляюцца сінонімамі да слова *грандыёзны*?

*1) механічны; 2) пластычны; 3) велічны;*
*4) рашучы; 5) магутны; 6) вялікі.*

**А)** няма сінонімаў. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 3. **Г)** 3, 5, 6. **Д)** 4, 6.

**12.** Вучням трэба запісаць у алфавітным парадку назоўнікі, якія называюць толькі пароды сабак:

*1) колі; 2) аўчарка; 3) спаніэль; 4) пудзель; 5) лайка; 6) лунь.*

Вызначце правільны варыянт запісу.

**А)** 2, 1, 5, 6, 4, 3. **Б)** 2, 1, 5, 4, 3. **В)** 2, 5, 1, 3, 6.
**Г)** 3, 6, 2, 1, 5, 4. **Д)** 5, 1, 2, 4, 3, 6.

**13.** Дадзены словы: *1) выра..; 2) сонечны..; 3) га..; 4) сіні..; 5) кі...* Выберыце тыя словы, у якіх напішаце ў назоўным склоне на канцы літару ***й***.

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2, 3. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 4, 5.

**14.** Сымонка пісаў сачыненне пра сваю бабулю, яе майстэрства пячы смачныя булкі. Над адным сказам задумаўся: *Мая бабуля, каб атрымаліся смачныя булкі, па свайму ўласнаму рэцэпту...* Дапамажыце хлопчыку закончыць сказ.

**А)** расчыняе цеста. **Б)** рашчыняе цеста.
**В)** расшчапляе цеста. **Г)** расчапляе цеста.
**Д)** шчыпае цеста.

**15.** Якія назоўнікі з дадзеных у давальным і месным склонах маюць канчатак ***-і***:

*1) песня; 2) справа; 3) хлусня; 4) дарога; 5) трава; 6) зямля?*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1. **В)** 1, 3, 6. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 6.

**16.** У якіх словах націск падае на канчатак?

*1) завалка; 2) суша; 3) крапіва; 4) медны; 5) крама; 6) ярына.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 4, 5. **Г)** 3, 6. **Д)** 6.

**17.** Сымон прачытаў апавяданне пра работніка, які займаецца вырабам шкуры, але назаўтра забыўся, як яго называюць. Дапамажыце хлопчыку ўспомніць. Выберыце правільны варыянт.

**А)** грабар. **Б)** гарбар. **В)** цясляр. **Г)** шавец. **Д)** мадэльер.